# У пошуках новага

**У Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся абласны семінар на тэму «Бібліятэчнае краязнаўства: у пошуках новых форм і ідэй». Удзел прынялі загадчыкі аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі, аўтаматызацыі, краязнаўчай літаратуры цэнтральных бібліятэк Міншчыны, супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**

Ва ўрачыстай атмасферы гасцей з вобласці сустракалі з песнямі і святочным караваем. Семінар стартаваў з аграгарадка Багушэвічы, дзе ўдзельнікаў чакаў экскурс-рэйд «Аграгарадок — адметнасці куток», цэнтрам якога стала наведванне помніка архітэктуры XIX стагоддзя касцёла Божага Цела. Завяршылася экскурсія візітам у Багушэвіцкую інтэграваную сельскую бібліятэку-клуб. Загадчыца Тамара Бінжук пазнаёміла прысутных з дзейнасцю ўстановы.

У Паплаўскай інтэграванай сельскай бібліятэцы-клубе ўдзельнікаў семінара сустрэла бібліятэкар Валянціна Наскавец, якая таксама правяла экскурсію па ўстанове і расказала аб сучасных прыёмах папулярызацыі краязнаўчых матэрыялаў.

Далей госці накіраваліся ў раённы цэнтр рамёстваў, дырэктар якога Іна Хвашчэўская правяла ўсіх па выставачных залах, распавяла пра пакой-музей драўлянай лыжкі — адзіны музей такога роду ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама пазнаёміла з выставай керамікі і іншымі экспазіцыямі.

У другой частцы семінара ўдзельнікаў вітала раённая цэнтральная бібліятэка. Дырэктар Наталля Маеўская і загадчыца аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці Тамара Круталевіч правялі прэзентацыю інфармацыйна-краязнаўчага цэнтра і пазнаёмілі гасцей з дзейнасцю бібліятэчнай сістэмы раёна.

У навуковай частцы праграмы мерапрыемства з дакладамі выступілі прадстаўнікі бібліятэк вобласці. Мадэратарам семінара была загадчык аддзела бібліятэказнаўства Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Таццяна Лаўрык. Абмяркоўваліся пытанні літаратурнага краязнаўства, традыцыі і інавацыйныя формы працы, выдавецкая дзейнасць у галіне краязнаўства. Загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Тамара Круталевіч распавяла пра вопыт краязнаўчай працы ў бібліятэках раёна, новыя тэндэнцыі і дасягненні. Ад Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна выступіла загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры Марыя Барахоўская, якая прэзентавала дзейнасць свайго аддзела. Вучоны сакратар Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева Інэса Карпава распавяла пра выдавецкую і публікацыйную дзейнасць сваёй установы, што з'яўляецца важным складнікам краязнаўчай працы. Вялікае ўражанне на ўдзельнікаў семінара зрабіла выступленне загадчыка аддзела аўтаматызацыі Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі Наталлі Кагіцінай, якая агучыла дасягненні бібліятэкі ў рамках работы над анлайн-праектам «Краеведческий кейс Солигорска».




*Выступае Тамара Круталевіч.*

**Аляксандр БЫЧКОЎСКІ,**
**фота аўтара**